ПІ _____________________________________________

**Комплексная работа з тэкстам Д. Слаўковіча “Разумны аловак”**

## Разумны аловак

Тата купіў тры алоўкі. Прыгожыя. Усе тры аднолькавыя.

— Яны — тры браты, — сказаў тата. — Але ніводзін пакуль маляваць не ўмее. Мы іх завострым і паспрабуем навучыць.

Завастрыў тата алоўкі і раздаў: адзін — Ірынцы, другі — Веранічцы, а трэці — сабе паклаў.

Узялі паперу, селі за стол.

Ірынчын аловак дом намаляваў і дым з коміна. Татаў — зайчыка і лес. А Веранiччын — нічога. Так, рысачкі і крамзулькі розныя.

— Што гэта твой аловак не хоча старацца? — пытаецца тата ў меншай дачкі.

— І сама не ведаю, — адказвае тая.

— Не здольны, відаць, трапіўся, — сказала Ірынка.

— Трэба выкінуць і купіць новы, — парашыла малая.

— Э не. Так нельга. Ён жа не вінаваты. Яго проста яшчэ не навучылі.

І пачалі тата з Веранічкай удваіх алоўку паказваць. Веранічка трымае аловак, а тата — яе руку. І разам выводзяць.

Аловак урэшце зразумеў, чаго ад яго хочуць, і старацца пачаў. Цяпер вучыла ўжо толькі адна дзяўчынка, без таты.

З гэтага дня кожны вечар яны займаліся вучобай. І з кожным днём атрымлівалася лепш і лепш.

А неяк Веранічка сказала:

— Паглядзі, тата, які разумны мой аловак: ужо ўмее мячык і грыбок маляваць. А хутка і елачку намалюе.

*Даір Слаўковіч*

1. Знайдзі памылкі на малюнках і выпраў іх.



Малюнак таты



Малюнак Ірынкі



Малюнак Веранічкі

2. Знайдзі малюнак з героямі твора. Абвядзі лічбу, напішы членаў сям’і, адлюстраваных на выбраным малюнку.

1. 

2. 

_____________________________________________

3. Што казалі пра Веранічкін аловак кожны з герояў у пачатку твора? Злучы стрэлкамі імёны герояў і іх выказванні.

| | |
|---|---|
| тата | няздольны |
| Ірынка | не хоча старацца |
| Веранічка | не вінаваты, не навучылі |

4. Чаму Веранічкін аловак спачатку не маляваў?

€ быў дрэнна завостраны
€ быў самы маленькі
€ Веранічка не ўмела маляваць

5. Якія дзеянні выконвала Веранічка, каб яе аловак стаў разумным?

€ завастрыла аловак
€ вучылася маляваць разам з татам
€ вучылася працаваць толькі Веранічка
€ займалася вучобай кожны вечар
€ выкінула няздольны аловак і купіла новы

6. Адзнач рысы характару, якія дапамаглі Веранічцы навучыцца маляваць.

€ стараннасць € лянота
€ дабрыня € ветлівасць
€ цікаўнасць € кемлівасць

7. Чаму вучыць апавяданне “Чароўны аловак”? Адзнач адпаведную прыказку.

€ Вучыцца ніколі не позна.
€ Прыгожая птушка пер’ем, а чалавек вучэннем.
€ Без вучэння няма і ўмення.